

ЯКІЯ ЗМЯНЕННІ Ў ПРАЦОЎНЫМ КОДЭКСЕ? 2

ЛЕТА — ГЭТА МАЛЕНЬКАЕ ЖЫЦЦЁ... 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

15 ЛІПЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 137 (29759)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Кірыл КАРАЦЕЕЎ, першы намеснік генеральнага дырэктара СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка»:**

*«Мы назіраем вялікую цікавасць з боку расійскага бізнесу, дзелавых і ўрадавых колаў Расіі да нашага індустрыяльнага парка. Літаральна кожны дзень у нас праходзяць сустрэчы з расійскімі дэлегацыямі. Беларусь як індустрыяльная і інвестыцыйная платформа была даволі канкурэнтаздольная на рынку Еўропы ў святле цэн на энерганосьбіты, заработнай платы. Цяпер з улікам няпростай знешнеэканамічнай і палітычнай сітуацыі мы імкнёмся пераарыентавацца на рынкі РФ і ўжо бачым водгукі. Сумесна з расійскімі бізнесменамі развіваем праекты па беспілотных лятальных апаратах, будаўніцтве верталётаў, праекты ў галіне тонкай хіміі. У цэлым стараемся стварыць шырокі спектр узаемадзеяння».*

# ВЯСЁЛКА ТАЛЕНТАЎ НАД ВІЦЕБСКАМ

## Яшчэ да ўрачыстага адкрыцця на «Славянскім базары» загучалі імёны прадстаўнікоў Беларусі




Фота БелТА.

**Учора позна ўвечары над Віцебскам прагучалі ўрачыстыя фанфары адкрыцця чарговага, ужо трыццаць першага па ліку, «Славянскага базару». Як заўжды, галоўная музычная падзея лета сабрала сотні ўдзельнікаў і тысячы гледачоў.**

Фестываль успрымаецца найперш як прыгожае папулярнае свята, але ж імпэт прадстаўнічага спаборніцтва прысутнічае на ім кожны год. Для гаспадароў-беларусаў трыццаць першы «Базар» яшчэ да цырымоніі ўрачыстага адкрыцця распачаўся з прыемных навін. Прадстаўнік нашай краіны на дзіцячым музычным конкурсе «Віцебск» Елісей КАСІЧ па выніках двух выступленняў набраў максімальныя сто сорак балаў, атрымаўшы высокую ацэнку і ад журы, і ад гледачоў у зале.

А на Алеі зорак, на якой увекавечваюцца імёны лаўрэатаў спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» (якую на цырымоніі адкрыцця звычайна ўручае сам кіраўнік нашай дзяржавы) учора з'явілася зорка нашага легендарнага Анатоля ЯРМОЛЕНКІ — кіраўніка не менш легендарных «Сяброў». Народны артыст Беларусі падчас адкрыцця імяннай зоркі сказаў, што прысвячае сваю ўзнагароду ўсім, хто з ім калі-небудзь працаваў.

*Аб тым, як праходзіла цырымонія адкрыцця, ужо можна прачытаць на нашым сайце zviazda.by і ў заўтрашнім нумары газеты. А сёння мы падрабязна раскажам пра першыя дні фестывальнага Віцебска, які жыве святам ужо з пачатку тыдня.*

**СТАР. 4**



## КОРАТКА

• **На малой радзіме Пятра Клімука прапануюць прысвоіць школе імя першага касманаўта Беларусі.**



• Украінскім дзецям у Беларусі маюць намер даць права атрымліваць адукацыю на ўсіх узроўнях.

З нагоды

# КОЛЬКІ КАШТУЕ ШКОЛЬНАЯ ФОРМА?

### З сённяшняга дня па ўсёй краіне адкрываюцца школьныя базары

**З 15 ліпеня па ўсёй краіне стартуе пашыраны продаж тавараў школьнага асартыменту. Ва ўсіх рэгіёнах будзе працаваць каля 400 школьных базараў, правядуць распродажы і кірмашы выхаднога дня. Дарэчы, зніжкі ў тых жа сталічных універмагах могуць скласці ад 20 да 35 %. Магчыма, бацькам варта задумацца аб экіпіроўцы школьнікаў ужо цяпер, пакуль у гандлі прадстаўлены самы шырокі асартымент — каля 400 мадэляў адзення і больш за 100 мадэляў абутку.**

**Дзелавы касцюм для малодшага школьніка сёлета будзе каштаваць ад 70-80 рублёў, старэйшага — ад 80-100 рублёў. Аптымальная школьная экіпіроўка разам з дзелавым касцюмам, спартыўнай формай, пісьмовымі прыладамі і канцылярскімі таварамі абыдзецца сёлета ў 330—1300 рублёў.**

**СТАР. 3**



ISSN 1990 — 763X

22137

9 771990 763008

Заканатворчасць

# Зарплата не радзей чым два разы на месяц і электронны подпіс

## Якія змяненні чакаюцца ў Працоўным кодэксе



Фота БелТА.

**Дэпутаты прадаўжаюць работу над законапраектам «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін». Ён рыхтуецца да разгляду ў першым чытанні на асенняй сесіі. Аб навацыях законапраекта карэспандэнту БелТА расказала старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ.**

### Без уласнаручнага подпісу

Унясенне змяненняў у Працоўны кодэкс абумоўлена неабходнасцю ўдасканалення яго нормаў з улікам практыкі прымянення. Праект закона «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін» накіраваны на комплексную карэкціроўку кодэкса ў частцы замацавання шэрага гарантый для работнікаў.

«У прыватнасці, замацоўваецца магчымасць выкарыстання ў працоўных адносінах аналагаў уласнаручнага подпісу (ЭЛП і іншых) разам з уласнаручным подпісам. Адначасова ўносіцца карэкціроўкі ў шэраг артыкулаў Працоўнага кодэкса, што дасць магчымасць у асобных выпадках адмовіцца ад папяровага дакументаабароту. Напрыклад, пры азнаямленні работнікаў з загадамі (распараджэннямі) аб часовым пераводзе, з лакальнымі прававымі актамі, са змяненнямі ў працоўных абавязках работніка і ў некаторых іншых выпадках, калі ўзнікненне, змяненне, спыненне праваадносін можа быць бесперашкодна афармлена і пацверджана на працягу ўстаноўленага тэрміну без абавязковага выкарыстання ўласнаручнага подпісу.

### Агульны падыход да выплаты

Таксама ўстанаўліваецца агульны падыход да пытання перыядычнасці выплаты заработнай платы работніку, незалежна ад віду заключанага з ім працоўнага дагавора. Так, прапануецца ўнесці змяненні, якія накіраваны на тое, каб выплата заработнай платы ажыццяўлялася не радзей як два разы ў месяц, у тым ліку работнікам, з якімі заключаны кантракты», — расказала Людміла Кананoвіч.

### Правілы дыспансерызацыі

Працоўны кодэкс дапаўняецца новым артыкулам, які ўстанаўлівае гарантыі для работнікаў пры праходжанні дыспансерызацыі. «У прыватнасці, прадугледжваецца, што работнікі вызваляюцца ад работы для праходжання дыспансерызацыі на адзін дзень адзін раз у тры гады з захаваннем сярэдняга зарobку па месцы работы. Пры гэтым работнікі, якія дасягнулі ўзросту сарака гадоў, пры праходжанні дыспансерызацыі будуць вызваляцца ад работы з захаваннем сярэдняга заробку па месцы работы на адзін дзень адзін раз у год. Работнікі, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійннага ўзросту, а таксама на працягу пяці гадоў да дасягнення такога ўзросту, пры праходжанні дыспансерызацыі будуць вызваляцца ад работы на два дні адзін раз у год з захаваннем сярэдняга заробку па месцы работы, — адзначыла дэпутат. — Работнікі будуць вызваляцца ад работы для праходжання дыспансерызацыі ва ўзгоднены з наймальнікам дзень на аснове іх пісьмовай заявы і будуць абавязаны прадстаўляць наймальніку дакументы, якія пацвярджаюць праходжанне імі дыспансерызацыі».

### Водпуск з захаваннем зарплаты

Замацоўваюцца палажэнні аб прадастаўленні водпуску з сямейна-бытавых прычын (з нагоды вяселля, пахавання, нараджэння дзіцяці) з захаваннем заработнай платы. «У сувязі з гэтым у мэтах захавання гарантый работнікаў прапануецца ў артыкуле 190 Працоўнага кодэкса замацаваць норму аб магчымасці прадастаўлення работнікам на аснове калектыўнага дагавора, іншых лакальных прававых актаў не больш за тры каляндарныя дні з захаваннем сярэдняга заробку ў выпадках нараджэння дзіцяці, рэгістрацыі шлюбу, смерці блізкіх сваякоў (членаў сям'і), іншых уважлівых прычын. Пры гэтым замацоўваюцца нормы, згодна з якімі аплатны водпуск работнікам бюджэтных арганізацый будзе прадастаўляцца ў межах сродкаў, прадугледжаных у адпаведнасці з заканадаўствам на аплату працы на адпаведны фінансавы (каляндарны) год. Прадугледжваецца для замацавання шэраг новаўвядзенняў, якія датычацца забеспячэння балансу інтарэсаў наймальніка і работніка пры рэалізацыі права на навучанне работнікаў, што сумяшчаюць работу з навучаннем», — дапоўніла Людміла Кананoвіч.

Рэспубліканская асацыяцыя прадпрыемстваў прамысловасці (БелАПП) таксама падтрымана прапанова заканадаўцаў аб замацаванні нормаў, якія прадугледжваюць замену выдачы малака або раўнацэнных харчовых прадуктаў грашовай кампенсацыяй. Паколькі для значнай колькасці работнікаў існуюць пэўныя проціпаказанні да ўжывання малака.

«Хацелася б адзначыць, што работа над законапраектам прадаўжаецца. Але ўжо цяпер відавочны яго сацыяльная накіраванасць і ўлік інтарэсаў наймальнікаў і работнікаў», — падкрэсліла дэпутат.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Вываз збожжа з Украіны будзе праводзіцца ва ўмовах спынення агню

**По выніках «збожжавай сустрэчы», якая адбылася напярэдадні ў Стамбуле, прынята рашэнне, што вываз збожжа з Украіны будзе праводзіцца ва ўмовах рэжыму спынення агню. Як паведамляе ТАСС, аб гэтым піша газета The Wall Street Journal са спасылкай на крыніцы.**

Адзначаецца, што збожжа будзе вывозіцца з трох украінскіх партоў, грузы будуць перамяшчацца ў суправаджэнні ўкраінскіх суднаў. Пры гэтым у межах збожжавага маршруту будзе дзейнічаць рэжым спынення агню. Пустыя судны, якія будуць вяртацца ва Украіну, будуць правяраць ваенна-марскія сілы Турцыі, каб гарантаваць адсутнасць на караблях кантрабанднай зброі.

Шэраг тэхнічных пытанняў бакі ўсё яшчэ павінны ўрэгуляваць, адзначае выданне. У прыватнасці, пытанне размініравання. Як мяркуецца, пагадненне будзе падпісана ў час сустрэчы Уладзіміра Пуціна і Рэджэпа Эрдагана на наступным тыдні.

«Збожжавая сустрэча» адбылася ў Стамбуле 13 ліпеня, праходзіла яна за зачыненымі для СМІ дзвярыма. У перагаворах узялі ўдзел ваенныя дэлегацыі Расіі, Турцыі, Украіны, а таксама прадстаўнікі ААН. Як паведаміў генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш па выніках сустрэчы, у Стамбуле быў зроблены важны крок на шляху да таго, каб арганізаваць бяспечны вываз прадуктаў харчавання з Украіны праз Чорнае мора. Кіраўнік Міністэрства абароны Турцыі Хулусі Акар сказаў, што падагульняючы дакумент па гэтым пытанні плануецца падпісаць на наступным тыдні.

### МВФ прагназуе рэцэсію ў эканоміцы ЗША




**Злучаным Штатам будзе цяжка не дапусціць рэцэсіі ў сваёй эканоміцы. Шэраг негатыўных фактараў толькі пагаршае сітуацыю. Аб гэтым гаворыцца ў дакладзе МВФ, паведамляе ТАСС.**

У дакладзе адзначаецца, што адысці ад рэцэсіі ў ЗША становіцца ўсё цяжэй. Пры гэтым працяг пандэміі каранавіруса, перабоі ў ланцужках паставак і канфлікт ва Украіне будуць несці для ЗША дадатковыя рызыкі.

У МВФ адзначылі, што няправільныя рашэнні Вашынгтона, у тым ліку ў пытаннях барацьбы з інфляцыяй, могуць прывесці да негатыўных наступстваў у ЗША, а таксама паўплываць на эканамічную сітуацыю ў свеце.

У сваіх рэкамендацыях эксперты МВФ адзначылі, што ЗША варта адмовіцца ад гандлёвых абмежаванняў і павелічэння пошлін на тавары, а таксама актыўна супрацоўнічаць з іншымі краінамі для падтрымання шматбаковай гандлёвай сістэмы.

Таксама паведамляецца, што МВФ пагоршыў прагноз для ЗША на бягучы год па росце ВУП да 2,3 працэнта (зніжэнне на 1,4 працэнта), на 2023 год — да 1 працэнта (зніжэнне на 1,3 працэнта). Для параўнання, у 2021 годзе амерыканская эканоміка вырасла на 5,7 працэнта.

### Міністр абароны Ізраіля на сустрэчы з Байдэнам паспрабаваў адкрыць бутэльку зубамі

**Міністр абароны Ізраіля Бені Ганц падчас цырымоніі сустрэчы з прэзідэнтам ЗША Джо Байдэнам паспрабаваў адкрыць пластыкавую бутэльку з вадой зубамі. Кадры Ганца з бутэлькай аператыўна распаўсюдзіліся па сетцы.**

На відэа можна ўбачыць, што калі ізраільскай дэлегацыі, якая знемагала ад спякоты, прынеслі бутэлькі з вадой, міністр не стаў адкрываць бутэльку рукамі: 63-гадовы чыноўнік вырашыў звярнуцца да нестандартнага метаду — адкрыць бутэльку зубамі.

Мяркуючы па кадрах, Ганц нават не паспрабаваў адкрываць бутэльку з дапамогай рук, а прысутнасць на цырымоніі амерыканскага лідара і вялікай колькасці іншых людзей яго зусім не збянтэжыла. Ці атрымалася міністру адкрыць бутэльку і папіць — невядома.

Раней паведамлялася, што Джо Байдэн падчас свайго выступлення ў Ізраілі дапусціў агаворку аб Халакосце. Прэзідэнт ЗША пераблытаў словы honor (гонар) і horror (жах), але хутка выправіўся.

Блізкая ўлада

# НА ПРЫЁМ ДА НАТАЛЛІ КАЧАНАВАЙ

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правядзе 20 ліпеня асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, па адрасе: г. Мінск, вул. Кірава, д. 47, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

**Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца 13—15 ліпеня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00 па тэлефонах: 8 (017) 328-53-24, 8 (017) 328-58-11, а 16 і 17 ліпеня па тэлефоне 8 (017) 328-53-24.**

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 16 ліпеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея Анатолеўна ЛАЗАРЭВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Новыя тэхналогіі

# КАМУНАЛЬНІКІ ПРАПАНУЮЦЬ

## увесці экалагічны падатак

**Праблемныя пытанні і прапановы па ўдасканаленні абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі (ЦКА) і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР) абмяркоўваюць спецыялісты на рэспубліканскім семінары і II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Новыя метады і тэхналогіі абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі» ў Слоніме.**

Зыходзячы са складу камунальных адходаў, вызначаны тры асноўныя кірункі іх выкарыстання: адбор са смецця ДМР, выраб і выкарыстанне альтэрнатыўнага паліва (RDF-паліва) і выкарыстанне адходаў арганічнага паходжання, адзначыў **міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ.**

Летась у Беларусі было створана каля чатырох мільёнаў тон адходаў, з якіх каля 3,2 мільёна было сабрана і вывезена ў змешаным выглядзе. Астатняе — раздзельна сабранае смецце і нарыхтаваныя другасныя рэсурсы.

— Узровень выкарыстання ЦКА ў краіне ў 2021-м склаў 31,1 %. Найлепшы вынік пры гэтым паказала Брэсцкая вобласць і найменшы — Гомельская і Мінская. Пры гэтым пастаянна павялічваць узровень выкарыстання ЦКА за кошт збору другасных рэсурсаў мы не зможам, — заўважыў міністр. — Ужо цяпер на долю збору другасных матэрыяльных рэсурсаў у агульным аб'ёме выкарыстання адходаў прыходзіцца 20 %. Рэзерв для павелічэння за кошт здабывання з адходаў другасных рэсурсаў — 7—9 %. Павышэнне эфектыўнасці і забеспячэння запланаванага ўзроўню выкарыстання ЦКА магчымы толькі за кошт развіцця прамысловай перапрацоўкі адходаў шляхам укаранення і шырокага прымянення тэхналогій выкарыстання арганічнай фракцыі адходаў (36—38 %) і энергетычнага выкарыстання ЦКА (27—29 %).

Яшчэ адно праблемнае месца ў сістэме выкарыстання адходаў — недастатковае фінансаванне. Каб атрымаць дадатковую крыніцу фінансавання для стварэння аб'ектаў і стымулявання арганізацый, якія аказваюць паслугі па абыходжанні з ЦКА, і павялічыць выкарыстанне адходаў, міністр прапануе прыцягнуць інвестыцыі, бюджэтныя сродкі ў выглядзе экалагічнага падатку і іншых, а таксама ўласныя сродкі арганізацый (з прыбытку і амартызацыі).

Акрамя таго, для вырашэння праблемных пытанняў у сферы абыходжання з адходамі неабходная карэкціроўка заканадаўства, у прыватнасці, Закона «Аб абыходжанні з адходамі», Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», Закона «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)» у частцы бюджэтных арганізацый.

Ірына СІДАРОК.

# КОЛЬКІ КАШТУЕ ШКОЛЬНАЯ ФОРМА?

## З гэтага года — абавязковыя элементы адзення

Як адзначыў **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ,** да 2023/24 навучальнага года прадугледжана ўвядзенне адзіных элементаў школьнай формы. У кожнай навучальнай установе мусяць вызначыць, які гэта будзе элемент — напрыклад, гальштук або жакет з эмблемай ці іншае. Ёсць школы і гімназіі, якія ўвялі такія элементы некалькі гадоў таму, многія навучальныя ўстановы вызначыліся сёлета.

— Установа адукацыі мусіць праінфармаваць бацькоў, што вызначана ў якасці такога аб'яднальнага элемента. І многія школы ўжо зрабілі гэта. Бацькі могуць і самі пацікавіцца, калі раптам яны не праінфармаваныя, каб не памыліцца ў выбары астатніх элементаў дзелавога адзення, — адзначыў Аляксандр Кадлубай.

Ён нагадаў, што ўвядзенне дзелавога стылю адзення ў школах пачалося з 2006/2007 навучальнага года. Актуалізавана гэтае патрабаванне было ў 2019 годзе, калі ў правілы ўнутранага распарадку школ былі унесены пункт аб дзелавым стылі адзення.

— Мы хацелі б, каб да пачатку гэтага навучальнага года ўсе ўстановы адукацыі вызначыліся, які элемент будзе адрозніваць дадзеную школу ад іншых, — удакладніў намеснік міністра. — У 20 % устаноў адукацыі такая практыка і традыцыі ўжо склаліся. Цяпер гэта работа выходзіць на ўзровень усёй краіны.

Вырашаць, што стане абавязковым элементам школьнай формы, мусіць Савет установы адукацыі, куды ўваходзяць яе кіраўнік, настаўнікі, а таксама бацькі.

## Мінімальны кошт дзелавога касцюма — 70 рублёў

У арганізацыях гандлю прадстаўлены шырокі асартымент школьнага адзення — больш за 400 мадэляў, каля 100 мадэляў абутку, больш за 100 мадэляў партфеляў, ранцаў, рукзакоў, каля 100 мадэляў школьна-пісьмовых прылад. Школьны асартымент адзення і абутку прадстаўлены таварамі айчыннай вытворчасці. Школьнае адзенне беларускіх вытворцаў сёлета, акрамя прадпрыемстваў гандлю, можна набыць у інтэрнэт-крамах «Вайлдберыс» і «Азон». Для поўнага задавальнення пакупніцкага попыту асартымент папаўняецца за кошт імпарту.

— Пакуль продаж ажыццяўляецца ў спакойным рэжыме, пік попыту традыцыйна прыпадае на другую палову жніўня, — адзначае **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Наталля МЕЛЬНІКАВА.**

Паводле інфармацыі спецыяліста, сёлета арыенціровачны кошт камплекта адзення дзелавога стылю каштуе ад 70 рублёў.

— Для школьнікаў малодшых класаў мінімальны кошт ад 70-80 рублёў, старэйшых школьнікаў — 80-100 рублёў і вышэй. Адпускныя цэны на школьную форму ў прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам» выраслі на 10 %, што звязана з павышэннем кошту сыравіны, — удакладніла Наталля Мельнікава. — Арыенціровачны кошт школьна-пісьмовых і канцылярскіх прылад для малодшых класаў — ад 35 рублёў, для старэйшых класаў — ад 40 рублёў. Для школьнага асартыменту гандлёвымі арганізацыямі прымяняецца надбаўка 30 % і крыху больш. У асноўным гандаль не нажываецца на такіх таварах. На асартымент мінулых гадоў гандлёвая надбаўка складае ад нуля да 20 %.

## Зніжкі — да 70 %

Крамы сёння прапануюць гандлёвыя зніжкі і акцыі. На асартымент мінулых гадоў яны могуць дасягаць 70 %. Гандлёвымі арганізацыямі прапануюцца розныя праграмы крэдытавання і растэрміноўкі — як за кошт уласных сродкаў, так і за кошт банкаў. Ёсць магчымасць набыць тавары па картках «Халва», «Магніт», «Лёгкія пакупкі», «Смарт-картка», «Чарапаха», «Картка пакупак». Асобныя прадпрыемствы гандлю прадастаўляюць скідкі шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, — да 10-15 %. Такая інфармацыя маецца на сайтах арганізацый гандлю і раённых выканаўчых камітэтаў.

— «Белкніга» сёння прадастаўляе 5-працэнтную зніжку на метадычную літаратуру, крамы спажыўкааперацыі робяць зніжку да 15 % для шматдзетных, малазабяспечаных і сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, — прывяла прыклады Наталля Мельнікава.

У Мінску традыцыйна найбольш шырокі асартымент школьных тавараў прадстаўлены ў буйных сталічных універмагах — ГУМ, ЦУМ, «Беларусь» і Гандлёвы дом «На Нямізе». Асноўныя пастаўкі тавараў адбыліся ў маі бягучага года.

— Ужо сёння прапануецца больш за 200 мадэляў швейных вырабаў, каля 70 мадэляў трыкатажу, каля 70 мадэляў абутку. Летась універмагамі рэалізавана больш за 122 тысячы адзінак швейных і трыкатажных вырабаў, каля 23 тысяч пар абутку. У залежнасці ад пераваг дзяцей і бацькоў кошт аптымальнай экіпіроўкі школьніка ў гэтым сезоне складзе ад 330 да 1300 рублёў, — расказала **начальнік аддзела развіцця гандлю і паслуг ДА «Сталічны гандаль і паслугі» Анастасія МАКАРСКАЯ.**

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# Вышэйшая адукацыя — на экспарт!

## БДУ прызнаны пераможцам у намінацыі «Адукацыя» на конкурсе «Найлепшы экспарцёр 2021 года»

**Дыплом і памятную статуэтку прарэктару па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ Канстанціну КАЗАДАЕВУ ўручыў старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіл МЯТЛІКАЎ.**




Такая высокая ўзнагарода стала магчымай дзякуючы актыўнай рабоце Белдзяржуніверсітэта па навучанні замежных грамадзян. У БДУ праходзіць падрыхтоўку звыш 4,5 тысячы замежных студэнтаў з больш як 60 краін, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам па краіне. Яшчэ тры гады таму гэтая лічба вагалася ў межах 2,5 тысячы. За апошнія чатыры гады колькасць адукацыйных праграм на англійскай мове павялічылася амаль у шэсць разоў — сёння ва ўніверсітэце іх больш за 20.

Усяго па выніках 2021 года пераможцамі рэспубліканскага конкурсу сталі 20 прадпрыемстваў. 47 узнагароджаны заахвочвальнымі дыпломамі ў 20 розных намінацыях. У фінальным этапе спаборніцтва ацэньвалася фінансава-гаспадарчая дзейнасць 145 рэспубліканскіх прадпрыемстваў.

Для БДУ ўзнагарода ў конкурсе стала трэцяй за ўсю гісторыю яго правядзення. У 2016 і 2020 гадах універсітэт таксама быў удастоены такога статусу.

Конкурс «Найлепшы экспарцёр» праводзіцца штогод з 2009 года БелГПП сумесна з міністэрствамі архітэктуры і будаўніцтва, аховы здароўя, замежных спраў, лясной гаспадаркі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі і харчавання, транспарту і камунікацый, эканомікі, дзяржкамітэтамі, канцэрнамі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам, бізнес-саюзамі, НАН Беларусі, Беларускай універсальнай таварнай біржай, страхавой кампаніяй «Белэксімгарант» і адміністрацыяй Парка высокіх тэхналогій.

Конкурс накіраваны на стымуляванне развіцця экспартна арыентаванай вытворчасці, павышэнне прэстыжу таваравытворцаў на сусветным рынку, павелічэнне аб'ёмаў і канкурэнтаздольнасці экспартаванай прадукцыі.

У намінацыі «Адукацыя» лаўрэатаў сталі вызначаць з 2015 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# ТЭМПЕРАТУРА ЎНАЧЫ — ЯК РАННЯЙ ВОСЕННЮ, А ДНЁМ — ЯК НА СТАРЦЫ ЛЕТА

## Прычына пахаладання — паветраныя масы паўночнаатлантычнага паходжання

**Калі ў канцы чэрвеня мы знемагалі ад трапічнай спякоты, то ў другой дэкадзе ліпеня захаваецца халаднаватае з дажджамі надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. На працягу найбліжэйшых дзён тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца з паўночнага захаду Еўропы, і прахалодных няўстойлівых паветраных мас паўночнаатлантычнага паходжання. Таму да канца другой дэкады ліпеня захаваецца халаднаватае з дажджамі надвор'е. Тэмпературны фон будзе па-ранейшаму паніжаны — у асноўным на 1—6 градусаў ніжэй за кліматычную норму.**



У пятніцу ўжо традыцыйна будзе пераменная воблачнасць. Уначы месцамі па поўдні, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Вецер паўднёва-заходні, заходні 4—9 м/с, удзень парывы да 14 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 18 да 23 градусаў цяпла.

Першая хваля летняга холаду прыйдзе да нас ужо ў суботу. 16 ліпеня ўначы будзе пераважна без ападкаў, аднак удзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі туман. Вецер будзе заходні ўмераны, днём парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6—13 градусаў, удзень — 16—23 цяпла.

У нядзелю днём стане яшчэ халадней. Такім чынам, 17 ліпеня пройдуць дажджы, месцамі па краіне магчымыя навальніцы. Вецер заходні чвэрці ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература ноччу — ад плюс 7 градусаў да 13 цяпла, удзень — 15—20 градусаў са знакам плюс.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня таксама прагназуюцца ападкі. У панядзелак ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах у дзённы час магчымыя навальніцы. Тэмпература ўначы складзе ад 7 цяпла да плюс 13 градусаў, днём — 15—21 цяпла, па паўднёвым захадзе тэмпература паветра дасягне 23 градусаў вышэй за нуль.

У аўторак, 19 ліпеня, будзе таксама мокра, але трошкі цяплей. Чакаецца, што ноччу месцамі, а днём у многіх раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература ўначы будзе плюс 7—14 градусаў, а ўдзень — ад 16 цяпла па поўначы да плюс 25 градусаў па поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Фінансавая палітыка

# Кітайскі юань — у кошыку замежных валют



**Праўленнем Нацыянальнага банка нашай краіны прынята рашэнне аб уключэнні з 15 ліпеня кітайскага юаня ў пералік валют, якія ўваходзяць у склад кошыка замежных валют. Такім чынам, цяпер устанаўліваецца наступны ўзровень вагі валют пры разліку кошту кошыка: для расійскага рубля — 50 %, долара ЗША — 30 %, еўра — 10 %, кітайскага юаня — 10 %.**

У прэс-службе Нацбанка падкрэслілі, што пры прыняцці дадзенага рашэння ўлічвалася змяненне ў 2022 годзе структуры знешнеэканамічных патокаў і аб'ёмаў таргоў названымі валютамі ў ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа».

З улікам уключэння кітайскага юаня ў кошык замежных валют афіцыйны курс беларускага рубля да кітайскага юаня, як і да долара ЗША, еўра і расійскага рубля, будзе ўстанаўлівацца па выніках таргоў у ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа».

**Сяргей КУРКАЧ.**

«ПаБАЗАРым»

# ВЯСЁЛКА ТАЛЕНТАЎ НАД ВІЦЕБСКАМ



**Гімнасты Белдзяржцырка ў небе над паўночнай сталіцай, максімальны бал ад журы ў чатырох юных выканаўцаў XX Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2022» і «Зорны час» Марыя Стэфана П'етрадаркі на валошкавым фестывалі — «Славянскі базар у Віцебску» стартаваў.**



## ТРЫ, ДВА, АДЗІН... ПАЕХАЛІ!

З цырымоніі ўрачыстага ўзняцця сцяга «Славянскага базару» на плошчы Летняга амфітэатра пачаўся афіцыйны адлік сямі насычаных фестывальных дзён. Пачэснае права ўзняць сцяг над Віцебскам далі ўладальнікам Гран-пры Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2021» з Казахстана Рухіі Байдукенавай і першай прэміі Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2021» Канстанціну Мазуркевічу з Беларусі. Усяго за 31 год існавання аднаго з найбуйнейшых фестываляў мастацтваў у ім узялі ўдзел прадстаўнікі амаль 80 краін усіх кантынентаў, акрамя Антарктыды! 12 ліпеня юныя зорачкі дзіцячага музычнага конкурсу ў працэсе лёсавання абралі для сябе свае шчаслівыя нумары, пад якімі прадстаўлялі свае краіны два дні на сцэне канцэртнай залы «Віцебск». Наш зямляк Елісей Касіч выступіў першым з кампазіцыяй на роднай мове «Неба пажар», атрымаўшы ад журы вышэйшы бал — 70, а ўчора Касіч выступіў з хітом Селін Дыён «I Surrender» пад нумарам 7. Ацэньвае выступленні кампетэнтнае журы, у складзе якога кампазітары, музыканты і спевакі з Расіі, Казахстана, Літвы, Сербіі, Славакіі, Босніі і Герцагавіны, а некаторыя з іх — пераможцы конкурсу маладых выканаўцаў мінулых гадоў.



## ЦЫРК, ЦЫРК, ЦЫРК!

Ужо ўпадабаная гледачамі ўверцюра сёлета запрашала ў «Гэты чароўны цырк». Нават праліўны дождж, які па традыцыі даўно супраўваджае фестываль, не напужаў зацікаўленых гледачоў. Насычаную праграму ў Віцебск прывезлі артысты Белдзяржцырка разам з аркестрам пад кіраўніцтвам Юрыя Давальцова. На працягу дзвюх гадзін госці Летняга амфітэатра вандравалі па старонках гісторыі цыркавога мастацтва Беларусі ад мінулага да сучаснасці. Каляровым карагодам змяняліся нумары: ігралі на музычных інструментах малпы і каталіся на скейтбордах сабачкі, віртуозна жангліраваў більярднымі шарамі Станіслаў Абяртаеў, складаныя трукі акрабатаў не пакінулі без эмоцый ніводнага гледача. Пад бурныя апладысменты кружылі пад купалам амфітэатра паветраныя гімнасты Наталі Нарышкіна, Глеб Кузьменка і Анастасія Дончанка. Ілюзійны атракцыён пад кіраўніцтвам Веранікі Каспяравай пад гучнае «вау» пратыкаў шыпамі і закоўваў у ланцугі адважных асістэнтак. Камічныя замалёўкі трыа клоўнаў «Without socks» прыйшліся да спадобы не толькі дзецям, але і дарослым: хлопцы ўжо даўно адышлі ад звыклых вобразаў з чырвонымі насамі — сучасныя клоўны іграюць на музычных інструментах і па-майстэрску танчаць стэп. Закручвалі ў вузел жалезныя пруты і на зубах паднімалі бярвёны асілкі, кожны нумар — у суправаджэнні яркага і бліскучага шоу-балета. Майстэрства і віртуознасць артыстаў — працяг слаўных традыцый цыркавога мастацтва Беларусі, якое пад цяжарам гістарычных ліхалеццяў не знікла ў небыццё, а толькі ўдасканальвалася. Сведчанне гэтаму — цырк, які знаходзіцца ў цэнтры сталіцы нашай краіны і вядзе афіцыйны адлік сваёй гісторыі з 11 лютага 1959 года. Тысячы гадзін упартых трэніровак, рызыка для жыцця — усё гэта дзеля ўсмешак і іскрынак у вачах удзячных гледачоў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## НА ФЕСТЫВАЛЬНЫХ ПЛЯЦОЎКАХ

Здавалася б, што за 30 гадоў сцэна Летняга амфітэатра зведала ўсе змены, якія падуладныя чалавечай фантазіі, але і сёлета арганізатары знайшлі новую «разыначку» — цяпер ад галоўнай сцэны ў зал выходзіць подыум, а артысты будуць бліжэй да гледачоў. Новае светлавое афармленне — над сцэнай лунаюць тры круглыя канструкцыі з дзясяткамі сафітаў, якія выстройваюцца ў розныя фігуры ў залежнасці ад нумароў.

Кіпіць фестывальнае жыццё не толькі на галоўных канцэртных пляцоўках. Па-за сценамі амфітэатра ў горадзе працуюць дзясяткі інтэрактыўных дворыкаў на любы густ. На вуліцах Пушкіна і Талстога шырока разгарнуўся традыцыйны кірмаш рамёстваў «Горад майстроў», дзе прадаюцца вырабы з гліны, металу і саломы; сувеніры з дрэва, тэкстылю і скуры. Сёлета каля 300 народных майстроў з Беларусі і Расіі дэманструюць сваё рамяство, іх вырабы можна набыць на памяць аб горадзе на Дзвіне. У скверыку на вуліцы Кірава каляровым ланцугом расцягнуліся палаткі з адзеннем і аксесуарамі. На плошчы Свабоды працуюць кулінарныя падворкі, тут, дарэчы, пройдзе шэраг канцэртаў мясцовых артыстаў і конкурсаў.



З 15 да 16 ліпеня ў рамках «Славянскага базару» ў Свята-Успенскім кафедральным саборы пройдзе свята харавой музыкі «Славянскі благавест», у якім возьмуць удзел хары Данскога стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра (Масква), храма ў гонар святой блажэннай Матроны Маскоўскай (Віцебск) і іншыя.

16 ліпеня на плошчы Свабоды пройдзе адкрыты турнір нацыянальных танцаў «Танчым разам», які збярэ больш за 100 пар з усіх рэгіёнаў Беларусі, Смаленскай і Пскоўскай абласцей Расіі. Міжнародны конкурс кавальскага рамяства «Зніч» — 16—17 ліпеня, конкурс майстроў традыцыйнага ткацтва «Палатняныя пераплёты», свята традыцыйнага народнага касцюма — не хопіць гадзін у сутках, каб паспець наведаць кожную пляцоўку.

## «ЗОРНЫ ЧАС»

14 ліпеня ў Віцебску афіцыйна адкрылі міжнародны прэс-цэнтр. Сотні журналістаў прыехалі ў культурную сталіцу Беларусі, каб у кожнай краіне свету людзі ўбачылі закулісце валошкавага фестывалю і разам з удзельнікамі «Славянскага базару» праз мастацтва далучыліся да міру і ўзаемаразумення. Міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Пярцоў уручыў журналістам узнагароды за актыўную работу па асвятленні папярэдняга форуму, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін уручыў Падзякі прадстаўнікам СМІ. Яшчэ да афіцыйнага адкрыцця цэнтр пачаў руплівую работу: сюды ўжо 13 ліпеня завіталі музыкант Марыя Стэфана П'етрадаркі і ўдзельнікі праекта «Тэатральная лабараторыя». Кожны дзень фестывальнага тыдня прэс-цэнтра распісаны па хвілінах, тут зоркі айчыннай і замежнай эстрады будуць дзяліцца творчымі планамі і поспехамі з журналістамі — а мы, у сваю чаргу, з вамі, паважныя чытачы.

***Пра фестывальныя будні чытайце ў наступных выпусках «ПаБАЗАРым».***

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**



Сядзі і глядзі

# ЛЕГЕНДЫ СУСВЕТНАГА КІНО НА «КУЛЬТУРЫ»



**На наступным тыдні ў праграме «Легенды сусветнага кіно» ў эфіры тэлеканала «Культура» гледачы пачуюць аповеды пра жыццё і творчасць Кэры Гранта і Фрэнка Сінатры.**

У аўторак глядзіце расповед аб прадстаўніку «старога Галівуда» 1940-х і 1950-х гадоў — Кэры Гранта. Ураджэнец Вялікабрытаніі першыя крокі ў акцёрскай прафесіі зрабіў у вандроўнай цыркавой трупе ў сябе на радзіме, выступаючы пад імем Арчыбальда Алека Ліча. А пасля з'езду за акіян, дзе з 1921 года пачаў атрымліваць невялікія ролі ў тэатральных пастаноўках. Першае заўважнае з'яўленне на экране пад псеўданімам Кэры Грант адбылося ў 1933 годзе, калі выйшаў фільм «Яна абышлася з ім несумленна». Пазней акцёр праславіўся ў канцы 1930-х гадоў дзякуючы тонкай і характэрнай для яго іроніі ў выкананні шэрага роляў у салонных камедыях. І потым з поспехам быў задзейнічаны ў фільмах А. Хічкока: «Падазрэнне», «Злавіць злодзея», «Дрэнная слава». А ролі ў фільмах «Філадэльфійская гісторыя» (1940), «Грашовая серэнада» і «Толькі самотнае сэрца», на думку артыста, павінны былі прынесці яму намінацыю на «Оскар», але гэтую прэмію акцёр атрымаў толькі ў 1970 годзе за выдатныя дасягненні ў кінематографе.

А вось у пятніцу тэлеаўдыторыю чакае гісторыя поспеху амерыканскага акцёра, кінарэжысёра, прадзюсара Фрэнка Сінатры, які таксама стаў легендарным спеваком і здзейсніў рэвалюцыю ў музыцы XX стагоддзя. Ён, сын бедных італьянскіх эмігрантаў, дзякуючы сваім талентам прабіўся на музычны небасхіл і праз некалькі гадоў стаў кумірам моладзі 1940-х. Чаго каштаваў кожнаму з гэтых людзей іх поспех і як ім удалося нягледзячы ні на што не страціць веру ў свае сілы, даведаецеся пасля прагляду праграмы.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 150

Сваю новую задачу даслаў нам Аляксандр Зелянко з Маладзечна *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Kpf5, Фd7, Лh1, Ca8 (4).
**Чорныя:** Kph4, Ch3, пп. g4, g5 (4).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мадрыдзе фінішаваў турнір прэтэндэнтаў. Як і год таму, перамог Ян Няпомняшчы (Расія) — 9,5 бала з 14. На наступных месцах: 2) Дзін Ліжэнь (Кітай) — 8; 3-4) Тэймур Раджабаў (Азербайджан), Хікару Накамура (ЗША) — па 7,5; 5) Фабіяна Каруана — 6,5; 6) Аліраза Фіруджа (Францыя) — 6; 7-8) Ян-Кшыштаф Дуда (Польшча), Рычард Рапарт (Венгрыя) — па 5,5.

Ян Няпомняшчы нарадзіўся ў 1990 годзе. Чэмпіён Еўропы 2010 года, чэмпіён Расіі 2010 і 2020 гадоў. Пераможца камандных чэмпіянатаў свету (2013, 2019) і Еўропы (2015). У 2021 годзе саступіў Магнусу Карлсену ў матчы за сусветную карону.

Дзін Ліжэнь — Ян Няпомняшчы. 1. c4 e5 2. g3 c6 3. Kf3 e4 4. Kd4 d5 5. cd Ф:d5 6. Kc2 Kf6 7. Kc3 Фe5 8. Cg2 Ka6 9. 0-0 Ce7 10. Ke3 0-0 11. a3 Лe8 12. b4 Kg4!? 13. Cb2 Фh5 14. h4 Cf6 15. Фc2 K:e3 16. de Cf5 17. Ka4 C:b2 18. K:b2 Kc7 19. Kc4 Лe6! 20. Лfd1! Kd5! 21. Лd4?! h6 22. Фd2? Лae8! 23. Kph2 Cg4!? 24. Ka5 Лf6 25. Kpg1 g5 26. K:b7 gh 27. Kc5 h3 28. Л:e4 hg 29. Л:e8+ Kpg7 30. f4 Фh1+ 31. Kpf2 Ф:a1 32. Kp:g2 Ch3+, 0:1.

Аліраза Фіруджа — Ян Няпомняшчы. 1. e4 e5 2. Kf3 Kf6 3. K:e5 d6 4. Kf3 K:e4 5. c4 Kc6 6. d3 Kf6 7. d4 Ce7 8. d5 Ke5 9. Kd4 0-0 10. Kc3 Cg4 11. f3 Cd7 12. Ce2 c6 13. 0-0 cd 14. cd Фb6 15. Kph1 Лac8 16. g4 h6 17. h4 Лfe8 18. g5 hg 19. hg Kh5 20. Kpg2 Kg6 21. f4 Kh:f4+ 22. C:f4 Ф:b2 23. Ke4 Лc4 24. Ce3 C:g5 25. Лb1 Ф:a2 26. Лa1 Л:d4 27. Л:a2 Л:d1 28. C:d1 C:e3 29. K:d6 Лe7 30. Cb3 Cc5 31. K:b7 Cb6 32. Cc4 Лe3 33. Kph1 Ch3 34. Лc1 Cf5 35. Cf1 Ce4+, 0:1.

Фабіяна Каруана — Хікару Накамура. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cb5 Kf6 4. d3 Cc5 5. C:c6 dc 6. Kbd2 Ce6 7. 0-0 Cd6 8. Kb3 Фe7 9. Ka5 Лb8 10. Cg5 h6 11. Ch4 g5 12. Cg3 Kd7 13. d4 f6 14. Фd3 h5 15. de K:e5 16. C:e5 fe 17. Kc4 Лd8 18. K:d6+ cd 19. Фe3 g4 20. Kd2 a6 21. b3 0-0 22. f3 Фg7 23. fg hg 24. Лad1 d5 25. ed cd 26. Лde1 e4 27. Л:f8+ Л:f8 28. c4 Лe8 29. cd C:d5 30. Kf1 Фe5 31. Фh6 Фg7 32. Фd6 Cc6 33. Ke3 g3 34. hg Фe5 35. Фg6+ Фg7 36. Фd6 Фe5 37. Фh6 Ф:g3 38. Лf1 Фg7 39. Фh4 Фh7 40. Фg3+ Фg7 41. Фh4 Cd7 42. Лd1 Ce6 43. Kd5 Лf8 44. Ф:e4 Фh6 45. Лe1 Лd8 46. Ke7+ Kpf7 47. Kf5 Фf6 48. Лf1 Cd5 49. Kh6+ Kpg7 50. Фg4+, 1:0.

* * *

На турніры ў Візахапатнаме (Індыя; 146 удзельнікаў) Кірыл Ступак быў трэці, Аляксей Фёдараў — дваццаты, Міхаіл Нікіценка — трыццаць шосты. У Чэнаі (Індыя; 275 гульцоў) А.Фёдараў фінішаваў трэці, К. Ступак — пяты. У бліцтурніры на сайце chess.com (345 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік заняў 13-е месца, Сяргей Жыгалка — 38-е.

* * *

У Расіі абвешчаны міжнародны юбілейны конкурс «Аляксандр Феакціставу-75» у раздзелах: кааператыўныя маты за 2 хады (арбітр Валерый Гураў) і зваротныя маты за 3-5 хадоў (арбітр Анатоль Сцёпачкін). Тэмы вольныя. Кампазіцыі (не больш за 6 ад аўтара ў раздзеле, уключаючы сумесныя) на дыяграмах дасылаць да 1.09.2022 па электронным адрасе vkozhakin@mail.ru (з паназкай «ЮК А. Феакціставу-75»).

* * *

Задача М. Кошалая з мінулага выпуску рашаецца 1. Kf4! (1. Лa5? f4!). Задачы А. Азава і В. Жука: № 1. 1. Kpc2 Kpe3 2. Kc3, 1...Kpe4 2. Kpc3. Блізняты: а) 1. Kpc2 Kpe3 2. Kc3, 1...Kpe4 2. Kpc3; б) 1. Kc3 (2. Cf2x) Kpe3 2. Ce1. № 2. 1. Лf2 Kpe4 2. Ce6. Блізняты: а) 1. Ce6 Kpe4 2. Лh3; б) 1. Kpc4 (2. Лe4x) Kpe6 2. Лf7. Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Уладзімір Ізотаў, Васіль Барысевіч, Сяргей Цыльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Што пачытаць у часопісе «Алеся» ў ліпені?



### «ЗДЗЯЙСНЯЕЦЦА ТОЕ, У ШТО ВЕРЫШ»

Чароўны і моцны голас, перакананасць ва ўласным выбары і дакладнае ўяўленне таго, чаго хочаш дасягнуць, — так можна акрэсліць сакрэт сённяшняга поспеху Ганны Трубяцкой.

— Усведамленне, што я пасляховая артыстка, у мяне складвалася этапамі. Такое адчуванне ёсць у мяне і ў дадзены момант — у параўнанні з мінулым я цяпер адчуваю сябе больш запатрабаванай, — прызнаецца спявачка.

Сёлета Ганна Трубяцкая прадстаўляе Беларусь на Міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў «Віцебск-2022». Яна актыўна рыхтуецца да гэтай падзеі.

— Я кожную раніцу пачынаю з уяўлення, як усё пройдзе. Два гады таму думала: як хочацца апынуцца на сцэне «Славянскага базару»! А сёння я ўжо спраўбую ўявіць, як прыме мяне зала, як адрэагуюць гледачы і журы на падрыхтаваны сюрпрыз.

Напярэдадні фестываля «Алеся» гутарыць з артысткай пра творчасць, жаночую прыгажосць і сям'ю.

### НАВУЧАННЕ МУЗЫЦЫ ВЫХОЎВАЕ ДАБРЫНЮ

У гуках свайго інструмента — цымбалаў — ёй чуецца крыштальны звон ранішняй расы. Дырэктар Жодзінскай школы мастацтваў Эліна Мірашнічэнка з юнацтва паставіла сабе задачу — беспярэпынна развівацца ў музыцы і ўвесь час ісці наперад. Асвойвала складаную праграму, выкладала ва ўстановах адукацыі, спявала і іграла ў творчых педагагічных калектывах. І цяпер, нягледзячы на нагрузку і няпростыя абавязкі дырэктара школы, працягвае займацца з вучнямі. Заслугі Эліны Мірашнічэнкі былі адзначаны па выніках рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2021» у намінацыі «Духоўнасць і культура».

— Я ўвесь час у руху, імкнуся ўсё паспяваць, — кажа паспяховы кіраўнік, педагог, маці чатырох сыноў. Эліна Іванаўна лічыць: той, хто ў дзяцінстве наведваў заняткі па музыцы, будзе несці ў свет культуру і дабрыню, нават калі не стане прафесіянальным музыкантам. Пра тое, чаму баланс рамантыка і прагматыка важны для кіраўніка, як выхаваць з дзіцяці зорку і пра многае іншае дырэктар Жодзінскай школы мастацтваў распавяла «Алесі».

### З ЛЮБОЎЮ ДА РАДЗІМЫ, ЛЮДЗЕЙ, НАВАКОЛЛЯ

Таццяна Дземідовіч — старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат шматлікіх літаратурных конкурсаў. Аўтар кніг прозы «Саламяны дом», «Эх, Рамашкін!». Яе творы выходзілі на старонках рэспубліканскага перыядычнага друку, у калектыўных зборніках. Летась была ўдастоена высокай дзяржаўнай узнагароды — медаля Францыска Скарыны.

Для Таццяны Дземідовіч, як і для яе знакамітай землячкі Яўгеніі Янішчыц, усё пачынаецца з любові. Менавіта любоў напаўняе цяплом краявіды роднай Брэстчыны, натхняе на работу з таленавітымі людзьмі, якіх хочацца падтрымаць, і жывіць уласную творчасць.

— Усё сапраўды пачынаецца з любові — да Радзімы, людзей, наваколля, — лічыць пісьменніца. — А любоў абуджае натхненне. Творца дапамагае сваім чытачам паверыць у пераможную сілу любові.

Пра будні пісьменніцкай арганізацыі, імпэт да пакарэння літаратурных вяршынь і сямейную гармонію брэсцкая аўтарка вершаў і прозы распавяла «Алесі».

### ПРЫГАЖОСЦІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Таццяне Сонец, батаніку паводле адукацыі, падабаецца ствараць прыгажосць, любавацца ёю самой і дарыць яе людзям. Яе прысядзібны ўчастак — своеасаблівая візітная картка прафесіяналнага майстэрства. Акрамя ландшафтнага дызайну, Таццяна займаецца тым, што малюе карціны, якія ствараюць эфект вяртання ў дзяцінства, у той незвычайны час, калі свет усприймаўся яскравым, поўным цяплыні, свята і цудаў. Здаецца, аўтар карцін хоча нагадаць усім нам: расплюшчыце вочы, зірніце, які прыгожы свет, калі чалавек знаходзіцца ў гармоніі з Богам і прыродай.



— Мне прыемна, калі тое, што я раблю, знаходзіць водгук, — прызнаецца Таццяна Сонец. — Гэта ўсяляе веру ў сябе, стымулюе, пабуджае не спыняцца, а ісці наперад, шукаць новае, здзіўляць!

Пра цудоўны свет хараства, створаны жанчынай, чытайце на старонках «Алесі».

### «ЧАС ПІК» У ПАРУ БАБІНАГА ЛЕТА

У жыцці кожнай жанчыны здараецца «час пік». Ён можа прыйсціся не на энергічную маладосць, якая не ведае стомы, а на перыяд, калі ўжо хочацца збавіць абароты, пажыць для сябе. Але нярэдка высвятляецца, што ў нас яшчэ маюць вялікую патрэбу і дзеці, якія выраслі, і састарэлыя бацькі. Як заставацца добрай маці для дарослых дзяцей, клапатлівай дачкой для пажылых бацькоў і пазбегнуць эмацыянальнага выгарання, «Алесі» распавяла псіхолаг Вольга Прылішч.

### ЕЖА НА КАРЫСЦЬ ЗДАРОЎЮ

Няма інфармацыі больш супярэчлівай, чым пра карысныя і шкодныя прадукты, новыя сістэмы харчавання і пра тое, як скінуць або набраць вагу. Да чаго прыслухацца? Ці варта мяняць рацыён улетку? Якая дыета самая эфектыўная? Ці карыснае для арганізма інтэрвальнае галаданне? Чым небяспечнае вегетарыянства? Пра ўсё гэта «Алеся» спыталася ў галоўнага пазаштатнага дыетолага Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Марыны Паповай.

З ліпеньскага нумара «Алесі» вы таксама даведаецеся пра тое, як атрымаць прыгожы загар без шкоды для скуры, каму карысны і каму шкодны шпінат, якія вітаміны патрэбныя ўлетку, як стварыць капсульны гардэроб і пра іншае.

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 18.15, 0.30** Зона Х (16+).
**8.05** Зразумелая палітыка.
**9.10, 22.00 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 17.05 Драма «Дом для лялькі» (16+).**
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Серыял «Коп» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Драма «З кім павядзешся...» (16+)**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**21.00** Панарама.
**21.45** Гэта іншае.
**0.15** Сфера інтарэсаў.
**0.50** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.10** Тэлебарометр.
**9.05** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**10.05, 17.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 18.15 Серыял «Сінічка» (16+).**
**12.40** «Тры першыя спатканні» (16+).
**13.30, 21.15 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).**
**14.20** «На тыдзень» (16+).
**15.05, 0.20** «Да спаткання» (16+).
**15.55** Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
**16.15** «Вось такія людзі» (12+).
**16.30** «Вежа» (12+).
**20.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.15** «Веру не веру» (16+).
**23.15 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.10** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.50, 20.30, 23.45** Навіны культуры.
**8.15, 18.45 «Адвакат Ардашаў». Серыял (16+) [СЦ].**
**9.55, 17.50** Дакументальны цыкл «Краіна Саветаў. Забытыя правадыры» (12+) [СЦ].
**10.40, 16.45 «Візіт да Мінатаўра». Серыял (12+) [СЦ].**
**12.40** «Я ведаю!»
**14.00, 21.05 «Дыверсант. Канец вайны». Серыял (16+) [СЦ].**
**16.00** «Караль Ян Чапскі». Гісторыка-біяграфічны фільм (12+) [СЦ].
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Жывая спадчына».
**23.20** «Кампазітары Беларусі».

## Беларусь 5

**7.00, 22.00** Плаванне. Ліга ISL.
**9.05** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Белшына» (Бабруйск) — «Шахцёр» (Салігорск).
**11.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**11.45** Лёгкая атлетыка. Адкрыты кубак Беларусі.
**16.15** Баскетбол. Кубак Халіпскага. Юніёркі (U-18).
**18.05** Настольны тэніс. Камандны чэмпіянат Беларусі.
**20.00** Спорт-кадр.
**20.35** Аўтаспорт. Экстрым-Е.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**10.00** «Прапаганда» (16+).
**10.20** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15 Серыял «Сон як жыццё» (16+).**



**13.15, 22.20 Серыял «Пазнай мяне, калі зможаш» (16+).**
**15.00, 16.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**21.15 Фільм «Спытайце медсястру» (16+).**
**0.05** Час.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Глядзець усім!» (16+)
**9.30** «Па сутнасці».
**10.40, 23.10** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**11.30** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20, 20.40, 0.40** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.55** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 21.25** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50 «Зорге». Серыял (16+).**
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».
**22.00** «P.S.»

## МІР

**5.00, 2.35 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**
**7.00, 10.10 Серыял «Вангелія» (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 18.30, 2.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 17.55** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.05, 16.15** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.10** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.05** «Міравое пагадненне» (16+).
**18.50, 19.30** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.10, 21.05** «Слабае звяно» (12+).
**22.00, 22.50** «Назад у будучыню» (16+).
**23.40** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.05** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**0.30 Маст. фільм «Цырк».**
**2.15** «Даслоўна» (12+).

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Аб самым галоўным» (12+).
**12.35** «Кропкі над і» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «60 хвілін» (12+).
**17.35 Серыял «Пісьмы на шкле. Лёс» (12+).**
**21.05** Урачыстая цырымонія закрыцця XXXI Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».
**22.45, 23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15, 7.25, 8.25, 16.45, 19.50. 22.00, 23.25** Сёння. Галоўнае.
**6.20** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.05** Будучыня сёння (12+).
**7.40, 22.05** «НЗ.by».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.40, 23.40 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).**
**10.35** Гісторыі выратавання (12+).
**11.00 Баявік «Марскія д' яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).**
**13.30** Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**16.55** «За гранню» (16+).
**17.55** «ДНК» (16+).
**20.05, 22.25 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.45, 17.55, 21.05, 0.50** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад. «Бос-малакасос» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Ключы Локаў» (12+).**
**8.15** «Паляванне і рыбалка».
**8.45 Серыял «Ратавальнікі Малібу» (12+).**
**10.15** «Любімае кіно».
**12.30 Фантастыка «Чарапашкі-ніндзя» (12+).**
**14.10 Серыял «Выдатнае стагоддзе» (16+).**
**15.50** Мультпарад. «Чып і Дэйл» (0+).
**16.15 Серыял «Вярніся, каханне» (16+).**
**18.00 Драма «Вікторыя» (12+).**



**18.55 Драма «Падводная лодка» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Ляўша» (16+).**
**23.10 Камедыя «Загадкавае забойства» (16+).**



## ВТБ

**6.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**7.55** «Лаві момант» (16+).
**9.00** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**9.20** М/ф «Звераняты» (6+).
**10.05** М/ф «Лекс і Плу» (6+).
**10.30** М/ф «Царэўны» (6+).
**10.55** Поўнаметражны анімацыйны фільм «Эверэст» (6+).
**12.30** «Гатуем як шэф» (16+).
**13.00** «Велабайкі» (16+).
**13.30** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**14.10** «Наш рамонт» (16+).
**14.40** «Пары на Канары» (16+).
**15.25** Баявік «Гладыятар» (16+).
**18.05** Баявік «Апошні самурай» (16+).
**20.40** Баявік «Робін Гуд» (12+).
**23.05** Драма «Пампеі» (12+).
**0.50** Жахі «Я іду шукаць» (18+).
**2.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**3.45** «Даеш моладзь» (16+).
**5.00** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Біблейскі сюжэт».
**7.05** «У лясным гушчары», «Дзед Мароз і лета», «Таямніца трэцяй планеты». М/ф.
**8.35** «Прэм'ера ў Сасноўцы». Маст. фільм [СЦ].
**9.50** «Звычайны канцэрт».
**10.15** «Перадзвіжнікі. Іван Крамскі» [СЦ].
**10.45, 21.25** «Памылка Тоні Вэндзіса». Маст. фільм [СЦ].
**12.55** «Узбекістан. Спляценне сонечных культур». Дак. фільм.
**13.25, 0.45** Дыялогі аб жывёлах [СЦ].
**14.05** «Дом вучоных».
**14.35** Балет «Рамэа і Джульета».
**16.55** «Міхаіл Лаўроўскі. Працяг будзе...» Дак. фільм.
**17.45** «Энцыклапедыя загадак» [СЦ].
**18.15** «Гары, гары, мая зорка». Маст. фільм [СЦ].
**19.45** «Прыгоды Арыстоцеля ў Маскве». Дак. фільм [СЦ].
**20.30** Лінія жыцця [СЦ].
**23.35** «Успамінаючы Элу Фіцджэральд».
**1.30** Шукальнікі [СЦ].
**2.15** «Лава», «Пер Гюнт». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» (18+).
**6.55, 8.40, 9.40, 11.35, 13.05, 14.50, 15.40, 23.40, 2.25, 3.40, 5.40** Музычная настальгія. (12+).
**7.20** Маст. фільм «Футбаліст» (18+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** «Да і пасля...» (16+)
**13.15** Маст. фільм «Паміраць не страшна» (18+).
**17.35** Музычная настальгія (12+).
**18.00** Маст. фільм «Дачка марака» (12+).
**19.15** «Непагаснае святло» (12+).
**21.00** «Быў час» (16+).
**0.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**1.00** Маст. фільм «Дараванне» (18+).

## EuroSport 1

**3.15** Кузаўныя аўтагонкі: Кубак свету Віла-Рэал (6+).
**4.00, 8.00, 12.00, 13.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Мужчыны (16+).
